# СТАРОНКІ БОЛЮ

## У Нацыянальнай бібліятэцы прайшла прэзентацыя зборнікаў “Без тэрміну даўнасці. Беларусь”




У шасці зборніках надрукавана больш за тысячу дакументаў, многія з іх упершыню сталі агульнадаступнымі. За кожнай старонкай – страты, гора, боль беларускага народа. Кожны са зборнікаў змяшчае інфармацыю пра ваенныя злачынствы 1941–1944 гадоў супраць мірнага насельніцтва рэспублікі. Тут можна пабачыць дакументы і ўспаміны сведкаў, якія датычацца знішчэння ў гета, канцэнтрацыйных лагерах, турмах. Уражваюць лічбы знішчэння вясковага насельніцтва. Работа па пошуку звестак пра “вогненныя” вёскі не спыняецца да гэтага часу. Апошняя лічба, якую агучылі архівісты, – 9300 спаленых населеных пунктаў.

З першых месяцаў акупацыі на захопленых беларускіх землях гітлераўцы праводзілі карныя аперацыі. Толькі на тэрыторыі Віцебшчыны такіх буйных аперацый было больш за 42. Такім чынам акупанты хацелі не проста знішчыць партызанскія атрады, але і пазбавіць іх любых рэсурсаў, пакінуць выпаленую зямлю. Падчас карных аперацый рабаваліся дамы, забіраліся сельгаспрадукцыя і скаціна, частку насельніцтва акупанты вывозілі на прымусовыя работы ў Германію. Безабаронных старых,жанчын і дзяцей палілі разам з хатамі. У Віцебскай вобласці больш за 240 вёсак у гады вайны гарэлі двойчы, яшчэ каля сотні – тры і больш разоў.

Як паведаміў дырэктар Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь Андрэй Дземянюк, праца над зборнікамі вялася два гады, былі прагледжаны дакументы Нацыянальнага і абласнога архіваў. За гэты час устаноўлены новыя факты, удакладнены і дапоўнены раней вядомыя звесткі. У навуковы зварот уводзяцца ўнікальныя крыніцы злачынстваў фашысцкіх акупантаў.

Шасцітомнік прадстаўляе дакументы пра злачынствы, здзейсненыя ў кожнай вобласці, а таксама дакументы звязаныя з расследаваннем тых падзей і мемарылізацыяй памяці. Сярод крыніц, выкарыстаных пры падрыхтоўцы кніг – дакументы з архіўных фондаў Беларускага штаба партызанскага руху, крымінальныя справы пасляваенных гадоў на злачынцаў, якія знішчалі безабаронных людзей і былі

асуджаныя ваеннымі трыбуналамі на тэрыторыі Беларусі.

Шасцітомнік – вынік напружанай работы гісторыкаў, архівістаў, краязнаўцаў. У кнігах пададзены дакументы з архіваў не толькі Беларусі, але і Расіі, Германіі, Злучаных Штатаў Амерыкі. Новыя ўнікальныя звесткі будуць карысныя даследчыкам, якія распрацоўваюць тэмы, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной.

Беларускія архівісты пры падрыхтоўцы выдання шчыльна супрацоўнічалі з расійскімі калегамі з фонда "Гістарычная памяць" і "Асацыяцыяй гісторыкаў Саюзнай дзяржавы "Саюзная ініцыятыва памяці і згоды". У Расіі ў 2020 годзе на федэральным узроўні ужо быў рэалізаваны такі ж праект "Без тэрміну даўнасці".

Матэрыялы, прадстаўленыя ў зборніках, ляглі ў аснову крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа ў гады вайны. Кіраўнік следчай групы па расследванні крымінальнай справы, начальнік упраўлення па надзоры за расследаваннем асабліва важных крымінальных спраў Генеральнай пракуратуры Валерый Талкачоў заўважыў, што ў час расследавання стала відавочным, што маштаб трагедыі быў знайчна большым, чым лічылася раней. Удакладняць і устанаўліваць новыя звесткі дапамагаюць вучоныя, гісторыкі і простыя грамадзяне. Ужо апытана больш за 12 тысяч сведак, сярод якіх як непасрэдныя ўдзельнікі ваенных падзей, так і нашчадкі, якім бацькі і дзяды распавядалі пра злачынствы, што адбываліся. Новыя даныя паступаюць у пракуратуру і пры падтрымцы калег з Расійскай Федэрацыі. Створана сумесная следчая група са следчым камітэтам РФ, рабочая група з Генеральнай пракуратурай Расіі. Як вынік, штомесяц паступаюць звесткі, аблічбаваныя дакументы, у тым ліку нямецкія.



■ Прэзентацыя выдання ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі

Вялікая ўвагаўдзяляецца інфармацыйнаму, ідэалагічнаму і прававаму кірунку. Летась быў прыняты Закон "Аб генацыдзе беларускага народа. Праводзіцца работа, накіраваная на выхаванне падрастаючага пакалення. Сёння, калі ў свеце пераглядаецца гісторыя і многія даныя скажаюцца, важна данесці праўду да моладзі. Як заўважыў Валерый Талкачоў, такім чынам мы захоўваем памяць пра ахвяр, пра подзвіг нашых продкаў, што з'яўляецца духоўнай асновай жыцця нашага грамадства. Інфармацыйная, прававая, ідэалагічная работа будзе працягнута на аснове матэрыялаў крымінальнай справы.

Шасцітомнік "Без тэрміну даўнасці. Беларусь" утрымлівае вялікую колькасць жахлівых фактаў, змяшчае кадры з месцаў масавага знішчэння людзей, паказвае абгарэлыя і скалечаныя целы, папялішчы і разваліны. Ці павінна памяць пра Вялікую Айчынную вайну быць такой жорсткай? Ці трэба яе менавіта так падаваць новым пакаленням? Ці магчыма інфармацыяй пра вайну, як маштабную, невылечную рану, данесці наступным пакаленням пасыл аб недапушчэнні паўтарэння падобных трагедый? Дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзім Лакіза ўпэўнены, што з мэтай недапушчэння скажэння гістарычнай памяці трэба прымаць больш жорсткія рашэнні па прапагандзе і паказе гэтай праўды.

Алена **Дзядзюля**